# Акцыя « Ашмяны – светлы горад»

Супрацоўнікі і наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» прынялі ўдзел у акцыі «Ашмяны-светлы горад» у рамках рэалізацыі экалагічнай ініцыятывы «Павышэнне энергаэфектыўнасці і экалагічнасці сістэмы вулічнага асвятлення г.Ашмяны». Акцыя была арганізавана ў канферэнцзале ДУА «СШ №2г. Ашмяны», дзе быў прадстаўлены выніковы матэрыял па рэалізацыі экалагічнай ініцыятывы.

Ініцыятыва рэалізуецца пры падтрымцы праекта «Уцягванне грамадскасці ў экалагічны маніторынг і паляпшэнне кіравання аховай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні», што фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.

Удзел у рэалізацыі дадзенай ініцыятывы - наглядны прыклад для ўсёй мясцовай супольнасці ад дзяцей да пажылых грамадзян у частцы паляпшэння бяспекі асяроддзя іх пражывання і павышэння ўзроўню экалагічнай культуры насельніцтва.





